*А.В.Няборская*

# ТЭАТРАЛЬНАЯ ГІСТОРЫЯ СЛУЦКА ў XVII – пачатку XX ст.

Нясвіж, Слонім і Слуцк адыгралі значную ролю ў развіцці нацыянальнай культуры ў XVII–XVIII стст. Слуцк з 1612 г. належаў Радзівілам. Радзівілы – гэта не толькі вялікая сям’я, члены якой займалі вышэйшыя дзяржаўныя пасады на працягу некалькіх стагоддзяў, але і буйнейшыя землеўладальнікі, якім падпарадкоўваліся гарады і мястэчкі Клецк, Койданава, Копысь, Мір, Шчучын і інш.

У XVII–XVIII стст. у Слуцку дзейнічалі два праваслаўныя царкоўныя брацтвы, кальвінісцкая гімназія, езуіцкая калегія. Неад’емнай часткай навучальнага працэсу ў гэтых установах былі вучэбныя тэатральныя пастаноўкі. Вядома, што з 80-х гг. XVII ст. у Слуцкай гімназіі кальвіністаў вучні пад кіраўніцтвам настаўнікаў ставілі камедыі [2, с. 112].

У 1715–1736 гг. пры езуіцкай калегіі таксама існаваў школьны тэатр, у якім ігралі выхаванцы калегіі. Захавалася друкаваная праграма драмы на лацінскай мове “Ваенная доблесць, што з’явілася ад навукі”. У ёй расказваецца пра юнака, які, дзякуючы сваёй вучонасці і доблесці, выратаваў ад ворага родны горад. Тут жа была пастаўлена і другая драма – “Пасол” [2, с. 113–114].

Паколькі ў школьных тэатрах не было спецыяльных памяшканняў для пастановак п’ес, прадстаўленні даваліся часцей за ўсё ў рэкрэацыйных залах. Дарэчы, прыстасаванне такіх залаў да паказу школьных спектакляў было на той час з’явай звычайнай.

Вядома таксама, што многія школьныя спектаклі ў XVIII ст. ішлі ў пастаянных памяшканнях магнацкіх тэатраў. У сярэдзіне XVIII ст. у Слуцку пры княжацкім двары Гераніма Фларыяна Радзівіла быў адкрыты прафесійны тэатр. Геранім Радзівіл быў жорсткім эксплуататарам. Пасля яго смерці ў 1760 г. слуцкім князем стаў яго старэйшы брат, уладальнік Нясвіжа, Міхал Казімір, па мянушцы Рыбанька. Праз два гады ўладальнікам Нясвіжа, Слуцка, Міра і іншых велізарных тэрыторый стаў яго сын Караль Станіслаў – Пане Каханку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пачаліся тэатральныя прадстаўленні ў Слуцку ў 1751 г., калі з Вены прыбылі першыя артысты.

Асабліва Радзівіл захапляўся нямецкімі камедыямі і італьянскімі операмі. Вялікі прыхільнік прускай ваеннай школы Геранім Фларыян любіў пастаноўкі драм на нямецкай мове з батальнымі сцэнамі. Спецыяльна для тэатра былі напісаны на нямецкай мове драмы, разлічаныя на тэатральныя карціны з выхадам на сцэну групы салдат: узяцце штурмам крэпасцей, фехтаванне, сцэны пакарання смерцю на шыбеніцы і інш. У спектаклях былі заняты салдаты гарнізона, кадэты з кадэцкага корпуса: у параднай форме, са зброяй яны служылі і "ўпрыгожаннем" залы (іх ставілі навыцяжку ля лож у час спектакляў).

Існавалі таксама тэатр марыянетак і тэатр ценяў, дзе нярэдка паказваліся камедыі дэль артэ і "турэцкія камедыі" [4, с. 357].

У тэатры выступалі спевакі, танцоўшчыкі, прыдворная "капэла" музыкантаў. У спектаклях прымалі ўдзел замежныя і мясцовыя акцёры і музыканты. Князь Геранім запрашаў у Слуцк драматычных акцёраў, камедыянтаў, спявачак, музыкантаў з Італіі і Вены. Артыстаў рыхтавалі і з жыхароў Слуцка. Набіраліся найбольш здольныя юнакі і дзяўчаты, нават дзеці. Па загаду Радзівіла ў 1756 г. пры тэатры была створана балетная школа, у якую ўвайшлі таленавітыя дзеці слуцкіх мяшчан, да якіх далучыліся выпісаныя з Заходняй Еўропы негрыцяняты. Усяго навучаліся балетнаму майстэрству дзесяць юнакоў і хлопчыкаў, у тым ліку два негрыцяняці, і восем дзяўчынак, з іх адна негрыцянка. Некаторыя хутка прасунуліся дзякуючы свайму таленту (напрыклад, Каця Міхневіч). Да дзяцей балетных былі прыстаўлены гувернёр, эканомка, кравец і шавец з вучнямі, тры дзяўчыны-служанкі і слуга [3, с. 14]. Артысты тэатра падпарадкоўваліся суровай дысцыпліне і знаходзіліся пад наглядам каменданта крэпасці.

Гледачамі на спектаклях прыдворнага тэатра ў Слуцку былі толькі князь, члены яго сям'і, прыдворныя і госці. Зразумела, ні гараджане, ні тым больш сяляне і марыць не маглі аб тым, каб трапіць на спектакль. Зусім іншая сітуацыя была з балетам, дзе асноўны кантынгент акцёраў складалі белару-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сы. Балету ў тэатрах Нясвіжа і Слуцка надавалася вялікая ўвага. Ужо ў гады дзейнасці княгіні Уршулы Францішкі Радзівіл яму адводзілася роля ўстаўных нумароў у яе драматычныя і музычна-драматычныя творы. Вялікія самастойныя спектаклі на пастаральныя тэмы і ў выглядзе дывертысментаў наладжваліся пры дварах князя Гераніма і князя Караля ў Нясвіжы. Апошні выпісваў для выхаванак сваёй балетнай школы многіх першакласных замежных балетмайстраў. Але і раней, у канцы XVIII ст., танцам у Радзівілаў надавалася вялікая ўвага. У іх бачылі адзін са сродкаў "высакароднага" выхавання маладога княжацкага пакалення.

Князь Геранім Радзівіл для балета ў Слуцку, а таксама для навучання прыгонных запрашае ў 1756 г. італьянскага харэографа А.Пуціні і балетмайстра-француза Луі Максіміліяна Дзюпрэ. Апошні меў вопыт работы ў оперы Парыжа і быў вядомы ў Еўропе як адзін з заснавальнікаў мужчынскага класічнага танца і настаўнік славутага Ж.-Ж.Навэра.

У 1760 г. пасля смерці Гераніма Міхал Казімір перавёў тэатр у Нясвіж, уключыўшы артыстаў у склад сваёй трупы. У Нясвіж былі вывезены і тэатральныя касцюмы і дэкарацыі [3, с. 14]. А слуцкі балет стаў асновай нясвіжскай балетнай трупы, што значна ўмацавала тэатр і зрабіла яго лепшым у Беларусі.

Слуцкі тэатр адрадзіў у 1762 г. новы яго ўладальнік Караль Радзівіл. Ён прыцягвае да работы ў 1762 г. вядомага ў той час балетмайстра Якуба Аліўе. Менавіта ў Слуцку быў падрыхтаваны першы беларускі балетмайстар А.Лойка, які пазней працаваў у Нясвіжы. У першай палове XVIII ст. у Слуцку працаваў пастаноўшчык Ян Тадэвуш Клаўс, які арганізоўваў тэатральныя прадстаўленні, школьныя святы і рыхтаваў для іх дэкарацыі.

Для тэатральных патрэб спачатку выкарыстоўвалі то манеж, то памяшканне зброевай палаты замка ў Слуцку. У 1752 г. пад тэатр перабудавалі на тэрыторыі замка былы судны дом, які быў адабраны Радзівіламі ў праваслаўнага духавенства. Можна меркаваць, што памяшканне гэта было даволі вялікім, таму што ў ім ставіліся і оперы, і балеты. Тут спектаклі ішлі да 1756 г. Нарэшце, у 1758 г. у Слуцку быў закладзены паста-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

янны будынак тэатра – “камедыхаўз”, а ў верасні 1759 г. ён быў канчаткова завершаны. Драўляны будынак тэатра знаходзіўся на тэрыторыі старога горада. У тэатры былі абабітыя палатном і размаляваныя сцены і столь. Лаўкі для гледачоў былі абцягнуты блакітным і чырвоным сукном, партэр акружаны ложамі. Для князя і яго сваякоў ставілі канапу, абабітую пунсовым шоўкам. Тэатральная зала, упрыгожаная люстрамі, мела неглыбокую сцэну з заслонай. Ад партала ў глыб сцэны было замацавана на рухомых рамах трыццаць шэсць намаляваных на палатне кулісных перасоўных дэкарацый. Перад сцэнай адводзілася спецыяльнае месца для аркестра. У закуліснай частцы меліся два артыстычныя пакоі. Побач з тэатрам знаходзіліся флігелі, дзе жылі музыканты, спевакі, а таксама размяшчалася балетная школа. На жаль, будынкі тэатра і флігеляў не захаваліся.

Слуцкі тэатр часта выязджаў у Нясвіж, а брат Гераніма Фларыяна адтуль высылаў свой тэатр у Слуцк. Увечары, а часта адразу пасля абеду прадстаўлялі драмы, аперэты і оперы. Тэатры абменьваліся трупамі, наогул сувязі паміж двума тэатрамі былі цесныя [5, с. 27].

Следам за Нясвіжам і Слуцкам узнікаюць буйныя тэатры ў Слоніме і Гродне. Для ўзмацнення славы і бляску свайго двара Геранім Фларыян адкрывае тэатры ў трох вотчынах – Жолкві (1753), Бялым (1761) і Алычаве (1753). Прадстаўленні ў іх ідуць папераменна са спектаклямі ў Нясвіжы і Слуцку. У рэпертуары, акрамя вялікіх балетаў, з’яўляюцца трагедыі; расце акцёрскае майстэрства, больш прафесійным становіцца балет, удасканальваюцца дэкарацыі.

У другой палове XIX ст. у Слуцку гастралявалі артысты з Масквы і Пецярбурга, польскія, а таксама ўкраінскія тэатры М.П.Старыцкага, М.Л.Крапіўніцкага і інш.

З XVI ст. шырока быў распаўсюджаны беларускі народны тэатр батлейка. У канцы XIX – пачатку XX ст. батлеечныя сцэнкі пачалі іграць людзі, і тэатр сталі называць жывой батлейкай. На Случчыне з’яўляліся інсцэніраваныя сюжэты народных казак і песень. Батлеечнікі часта выступалі на кірмашах і ў святочныя дні. Пасля 1917 г. яны выступалі ўжо вельмі рэдка. Апошні паказ батлейкі адбыўся ў 1963 г. у вёсцы Бялевічы Слуцкага раёна.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Алексніна І.А.* Слуцкая балетная школа // Тэатральная Беларусь: Энцыклапедыя. – Мн.: БелЭн, 2003. – Т. 2. – С. 356.

2. *Грицкевич А.П.* Древний город на Случи. – Мн.: Полымя, 1985. – 158 с.: ил.

3. *Барышаў Г.І.* Прыгонная Тэрпсіхора Слуцка // Літаратура і мастацтва. – 1980. – № 31. – 1 жн. – С. 14.

4. *Барышаў Г.І.* Слуцкі тэатр Радзівіла // Тэатральная Беларусь: Энцыклапедыя. – Мн.: БелЭн, 2003. – Т. 2. – С. 357.

5. *Miller A.* Teatr polski i muzyka na Litwie jako strażnice kultury zachodu (1745–1865). – Wilno: Studjum zdziejów kultury polskiej, 1936. – С. 27.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ